*В.І.Стражаў,*
*міністр адукацыі*

# Ў добры шлях!

У час рэфармавання ўсяго грамадскага развіцця і адукацыйна-выхаваўчай сістэмы адбылася знамянальная падзея ў выдавецкай справе: заснаванне навукова-метадычнага часопіса "Гісторыя: праблемы выкладання". Дазвольце выказаць надзею, што новае выданне зойме адпаведнае месца ў вырашэнні праблем выкладання гісторыі, якія паўсталі перад гістарычнай адукацыяй і грамадствам.

Стварэнне часопіса — гэта крок наперад у спалучэнні тэорыі гістарычнай навукі, вопыту выкладання і выхавання маладога пакалення. Выкладчыкі сярэдняй і вышэйшай школы будуць мець магчымасць карыстацца здабыткам індывідуальнага вопыту, які з'яўляецца невычарпальнай крыніцай агульных намаганняў у дыдактыцы гісторыі. Разам з тым, часопіс павінен адыграць значную ролю ў павышэнні навукова-метадычных ведаў настаўнікаў. Распрацоўка новых даследчых і педагагічных тэхналогій, дыдактычных сродкаў і іх укараненне ў выкладчыцкую справу — галоўны накірунак дзейнасці выдання.

Жадаю часопісу высока несці асветніцкія ідэі і плённай працы на гэтым вызначальным шляху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аіВ
АДУКАЦЫЯ і ВЫХАВАННЕ

**Заснавальнік і выдавец —**
рэдакцыя часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

*Галоўны рэдактар*
**У.П.Пархоменка**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: 220-54-81, 220-54-10

Штоквартальны
навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з І квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

**Выпуск 1 ' 97**
**І квартал**

# ГІСТОРЫЯ:
## праблемы выкладання



**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
М.І.Мініцкі
*Намеснік галоўнага рэдактара*
Н.М.Ганушчанка
*Адказны сакратар*
Л.В.Саламаха

І.І.Баргановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
С.В.Паноў
В.В.Сакалова
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава

Бібліятэка
БДПУ ім. М.Танка

*Мікалай Мініцкі,*
*галоўны рэдактар часопіса*

# Слова да чытача

Перш за ўсё лічу неабходным павіншаваць усіх, хто мае дачыненне да ганаровай і адказнай справы выкладання гісторыі, з нагоды адкрыцця навукова-метадычнага часопіса “Гісторыя: праблемы выкладання”. Назва часопіса, а спадзяёмся, што і змест, з’яўляецца рэагаваннем на запыт сучаснасці: якім павінна быць выкладанне гісторыі і што, наогул, дае людзям гэта навука.

Відавочна, існаванне гісторыка знаходзіцца ў інтэлектуальнай прасторы, якая абмежавана свабодай творчасці даследчыка ў пошуку аб’ектыўнай ісціны, а таксама сацыяльным заказам грамадства. Як казаў знакаміты французскі гісторык Л.Феўр, кожная эпоха мае свой Рым. Аднак Рым — гэта не толькі легендарны аповед, але і сама рэчаіснасць. Менавіта так гісторык, імкнучыся да ісціны, павінен арыентавацца на гістарычныя рэаліі, а таксама ўлічваць сацыяльны заказ. Тут паўстае пытанне аб свабодзе выбару і грамадзянскай пазіцыі аўтара.

Увогуле, гэта “вечныя” пытанні, якія былі заўсёды ўласцівыя гісторыі як навуцы і прадмету выкладання. Адказ на іх немагчымы без метадалогіі, і таму метадалагічныя пытанні зоймуць у нашай справе адно з вядучых месцаў. Распрацаваныя на гэтай выснове агульныя канцэпцыі гістарычнай адукацыі, дакладныя мадэлі прадметнага зместу, канкрэтныя метадычныя парады — прадмет штодзённага клопату часопіса.

Асаблівы наш клопат — распрацоўка новых тыпавых праграм па сусветнай і нацыянальнай гісторыі. Пачынаць гэтую справу неабходна з выбару зыходнай парадыгмы і базавых паняццяў, якія вызначаюць структуру і змест гістарычнай адукацыі. Структураванне паняццяў і зместу, на наш погляд, — адзін з галоўных шляхоў скарачэння аб’ёму падручнікаў. Культура інфармацыйнай прасторы вучэбных выданняў — актуальнейшая праблема сучаснай тэорыі падручніка. І таму рэдакцыя



будзе вітаць прапановы па стварэнні розных дыдактычных сродкаў абстрактна-лагічнага і знакава-сімвальнага характару.

У нашым часопісе мяркуем выдзеліць наступныя галоўныя накірункі: новы змест гістарычнай навукі, лабараторыя педагагічнага эксперыменту, вопыт выкладання, старонкі тэорыі і зместу новых падручнікаў, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у гістарычным даследаванні і навучанні. Але ж калі казаць аб “залатой сярэдзіне”, маючы на ўвазе агульную навукова-метадычную накіраванасць часопіса, то тут галоўным будзе імкненне даць матэрыялы “не столькі для навучання, колькі з мэтай пабуджэння да вучэння” (Аўл Гелій). Выходзячы з рэалій, пошук арыгінальных падыходаў будзе спалучацца з імкненнем даць дакладны матэрыял паўрочных распрацовак, разлічаных на базавы ўзровень навучальных праграм.

Мы маем намер трымаць настаўнікаў у курсе навуковых падзей як на Беларусі, так і за яе межамі. Адсюль увага да сувязей з аналагічнымі выданнямі ў блізкім і далёкім замежжы.

На старонках часопіса знойдзе адлюстраванне інфармацыя пра гістарычную літаратуру. Былы вакуум у кніжным свеце зараз змяніўся становішчам, якое нагадвае Вавілонскую бібліятэку, дзе кожны шукае, па словах Борхеса, сваю ўсеабдымную кнігу. Спадзяёмся, што настаўніку будуць карыснымі і наша парада, і простыя бібліяграфічныя звесткі пра новыя кнігі.

Усе накірункі нашай рэдакцыйнай дзейнасці будуць мець значна большую каштоўнасць пры зваротнай сувязі. Таму звесткі з месцаў, звароты чытачоў, іх пісьмы — асабліва важны матэрыял. Зараз звяртаемся да ўсіх вас з прапановай дасылаць нам свае артыкулы, меркаванні, запыты, парады.

За ўсёй “сумай тэхналогій” і дзеясных падыходаў гісторыка павінен хваляваць галоўны сэнс вывучэння гісторыі. Ён выказаны ў неўміручых прарочых словах: “Стойце на дарогах і глядзіце, і пытайцеся праз старавечныя сцежкі, ідзе добрая дарога, і хадзіце па ёй, і знойдзеце супынак душам сваім” (Ярэма, VI, 16). Спадзяёмся ісці па гэтым шляху разам з тымі, каго хвалюе лёс гістарычнай адукацыі і, наогул, гістарычнай мінуўшчыны.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ